# ЗАПРАШАЕ ЗАВОЧНЫ ФАКУЛЬТЭТ

Пралетарыі ўсіх краін, яднайцеся!

# Беларускі універсітэт

ВЫДАЕЦЦА З 1935 г.

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

ЧАЦВЕР 19 МАЯ 1977 г.

№ 18 (1168)

Цана 2 кап.

**Дарагія сябры! Перад вамі шырока раскрывае дзверы завочны факультэт адной са старэйшых навучальных устаноў рэспублікі — Беларускага ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна.**

**Мы запрашаем на вучобу і тых, хто толькі выбірае свой жыццёвы шлях, і тых, для каго пытанне «кім стаць!» даўно ўжо ператварылася ў канкрэтныя справы і турботы штодзённай работы.**

**Гэтым, апошнім, мы прадастаўляем магчымасць на працягу шасці год вучобы ўдасканальваць, папаўняць свае веды і атрымліваць новыя.**

**Завочны факультэт запрашае абітурыентаў на наступныя аддзяленні: рускай мовы і літаратуры, беларускай мовы і літаратуры, журналістыкі, гісторыі, правазнаўства, філасофіі, геаграфіі, біялогіі.**

**Пытанні завочнага навучання заўсёды з'яўляюцца прадметам спецыяльнага абмеркавання на пасяджэннях вучоных саветаў многіх факультэтаў.**

**Асабліва многа зрабілі для паляпшэння работы на завочным факультэце кафедры грамадскіх навук: кафедры гісторыі КПСС гуманітарных і прыродазнаўчых факультэтаў; навуковага камунізму; марксісцка-ленінскай філасофіі.**

**Вучэбны працэс на завочным факультэце здзяйсняецца асноўным саставам выкладчыкаў універсітэта. Большасць кафедр улічвае спецыфіку падрыхтоўкі спецыялістаў без адрыву ад вытворчасці, імкнецца прыцягнуць да работы з завочнікамі найбольш кваліфікаваных работнікаў, прафесараў, дацэнтаў, загадчыкаў кафедр.**

**Вялікая работа праводзіцца дэканатам завочнага факультэта ў перыяд паміж сесіямі. Сістэматычна арганізуюцца кансультацыі, датэрміновая здача экзаменаў і залікаў, устаноўлены дні завочніка.**

**З году ў год умацоўваюцца сувязі дэканата факультэта з установамі, прадпрыемствамі, арганізацыямі, дзе працуюць нашы студэнты. Сур'ёзныя адносіны да вучобы, глыбокія веды характарызуюць тую частку завочнікаў, якія вучацца на аддзяленнях, адпавядаючых профілю работы студэнта. Вучобу яны лічаць сваёй важнай і адказнай задачай, сур'ёзна адносяцца да падрыхтоўкі да экзаменаў і залікаў, сістэматычна працуюць у перыяд паміж сесіямі. Самадысцыпліна для іх — залог добрай паспяховасці, яна садзейнічае выпрацоўцы навыкаў самастойна плануемай работы, працаздольнасці.**

(Чытайце 2-ю і 3-ю старонкі).



# ПАВЫШАЦЬ ЭФЕКТЫЎНАСЦЬ І ЯКАСЦЬ НАВУЧАННЯ



У рашэннях XXV з'езда КПСС вызначаны магістральныя шляхі далейшага ўздыму ўзроўню падрыхтоўкі спецыялістаў, іх ідэйна-палітычнага выхавання, падкрэсліваецца, што «моц нашага ладу ў свядомасці мас».

Павышаць узровень падрыхтоўкі спецыялістаў—гэта значыць у першую чаргу клапаціцца аб навуковым змесце навучання, аб тым, каб вучэбны працэс сапраўды знаходзіўся на пярэднім краі навукова-тэхнічнага прагрэсу.

З вуснаў лектара студэнт павінен атрымаць усе новыя звесткі ў данай галіне навукі, а, прыйшоўшы на лабараторныя заняткі, — убачыць навейшыя прылады і абсталяванне, азнаёміцца з самымі сучаснымі метадамі даследавання. Як ніколі, у цяперашні час вучэбны працэс павінен быць пабудаван на цеснай дыялектычнай узаемасувязі з працэсам камуністычнага выхавання.

У выхаванні ў студэнтаў камуністычнай свядомасці, гатоўнасці, волі і ўмення будаваць камунізм кафедрам грамадскіх навук належыць галоўная роля. Бо вывучэнне моладдзю як прыродазнаўчых, так і гуманітарных факультэтаў грамадска-палітычных і сацыяльных навук адыгрывае рашаючую ролю ў фарміраванні ў іх камуністычнага светапогляду, высокіх маральных ідэалаў і разам з тым з'яўляецца састаўной часткай іх агульнанавуковай падрыхтоўкі.

Надзённай задачай з'яўляецца пастаяннае дасканаленне навучання і выхавання студэнтаў-завочнікаў, рацыянальнае выкарыстанне бюджэту часу, адведзенага вучэбнымі планамі на завочным аддзяленні. Патрэбна дабівацца таго, каб установачныя лекцыі для студэнтаў-завочнікаў не прадстаўлялі сабой скарочаны курс лекцый для студэнтаў стацыянара. Але каб зрабіць гэтыя лекцыі ўстановачнымі не толькі па форме, а і па зместу, выкладчык павінен арыентаваць студэнтаў на працяглую самастойную работу, вызначыць галоўныя праблемы курса, асноўную і дадатковую літаратуру. Мэтазгодна рыхтаваць спецыяльны курс установачных лекцый ці хаця б абмяркоўваць іх тэзісы на пасяджэннях кафедр.

На наш погляд, мэтазгодна чытаць на ўстановачных сесіях толькі некалькі лекцый па найбольш складаных тэарэтычных і праблемных пытаннях, а большую іх частку — у перыяд зімовай і вясновай экзаменацыйных сесій, калі яны патрэбны для сістэматызацыі і паглыбленныя ведаў студэнтаў.

Як адзначалася ў Справаздачным дакладзе ЦК КПСС XXV з'езду партыі, у сучасных умовах важна прывіваць навучэнцам уменне самастойна папаўняць свае веды, арыентавацца ў імклівым патоку навуковай і палітычнай інфармацыі. Неабходна дабівацца таго, каб студэнты-завочнікі самастойна вывучалі творы класікаў марксізму-ленінізму, рашэнні з'ездаў, канферэнцый і Пленумаў ЦК КПСС, а не падмянялі іх чытаннем кампілятыўнай літаратуры. Ва ўмовах больш высокіх патрабаванняў да кваліфікацыі спецыялістаў выкананне студэнтамі-завочнікамі кантрольных работ патрабуе карэннага перагляду. Гэты від вучэбнага працэсу выпрацоўвае ў студэнтаў-завочнікаў навыкі кампілятыўнага падыходу да вывучэння курса грамадскіх навук. Больш мэтазгодна замяніць яго рэферыраваннем глаў ці раздзелаў найбольш важных твораў У. І. Леніна, дакументаў Камуністычнай партыі і Савецкага ўрада, падрыхтоўкай даклада або лекцыі і выступленне з імі перад працоўнымі і г. д.

Неабходна таксама весці пошук актывізацыі маючыхся сродкаў узаемаадносін выкладчыка і студэнта-завочніка, новых форм кантролю і дапамогі. У гэтым плане вялікае значэнне маюць групавыя і індывідуальныя кансультацыі, якія праводзяцца як у міжсесійны, так і ў экзаменацыйны перыяд. Кафедра гісторыі КПСС прыродазнаўчых факультэтаў БДУ, напрыклад, шырока выкарыстоўвае бягучыя (групавыя і індывідуальныя) кансультацыі, якія праводзяцца ў міжсесійны перыяд: дні завочніка штотыднёва для пражываючых у г. Мінску і яго наваколлі, а таксама пісьмовыя кансультацыі ў форме метадычных указанняў кафедры па вывучэнню вучэбнага курса, пісьмовых адказаў на пытанні завочнікаў.

Неабходна дабівацца, каб студэнт, ідучы з кансультацыі, высвятляў усе незразумелыя пытанні. Таму на кансультацыях завочнікаў неабходна даваць больш вычарпальныя адказы на незразумелыя пытанні, рэкамендаваць літаратуру, дзе студэнт зможа атрымаць неабходныя звесткі па цяжка засвойваемых раздзелах праграмнага курса, па тых ці іншых цікавячых яго пытаннях.

**У. ЛАДЫСЕЎ,**
**старшы выкладчык кафедры гісторыі КПСС прыродазнаўчых факультэтаў, кандыдат гістарычных навук.**

# …ЛЕННЕ

пракурорска-следчы. У працэсе навучання студэнты праходзяць вучэб[illegible]ую і вытворчую практыкі ў наро[illegible]х судах, пракуратуры, следч[illegible] органах, у юрыдычных аддзелах прадпрыемстваў і устаноў. Заканчваецца навучанне абаронай дыпломнай работы і здачай дзяржаўных экзаменаў.

У сувязі з тым, што работа следчага, суддзі, пракурора, адваката патрабуе не толькі юрыдычных ведаў, але і пэўнага практычнага і жыццёвага вопыту, правіламі прыёму на юрыдычны факультэт устаноўлены некаторыя асаблівасці, забяспечваючыя перавагі пры паступленні для асоб, маючых стаж работы ці праслужыўшых ва Узброеных Сілах СССР.

**І. А. ЮХО,**
**намеснік дэкана, дацэнт.**



# ФІЛАЛАГІЧНАЕ АДДЗЯЛЕННЕ

У сістэме падрыхтоўкі філалагічных кадраў вышэйшай кваліфікацыі, настаўнікаў-славеснікаў важнае месца адводзіцца завочнаму навучанню. Сярод шматлікіх спецыяльнасцей, па якіх вядзецца падрыхтоўка на завочным факультэце, ёсць і дзве філалагічныя — руская мова і літаратура і беларуская мова і літаратура. Авалоданне гэтымі спецыяльнасцямі, набыццё багатых і трывалых філалагічных ведаў, навукова-педагагічнай кваліфікацыі ажыццяўляецца на аддзяленнях рускай мовы і літаратуры і беларускай мовы і літаратуры філалагічнага факультэта.

Філалагічны факультэт — адзін са старэйшых і буйнейшых ва універсітэце. Яго гісторыя пачынаецца з 1922 года, калі ў саставе БДУ імя У. І. Леніна быў арганізаван педагагічны факультэт з літаратурна-лінгвістычным аддзяленнем. Як самастойная адзінка філалагічны факультэт аформіўся пазней — у 1939 годзе. Цікава, што сярод першых выкладчыкаў будучага філалагічнага факультэта быў народны паэт Беларусі Якуб Колас. Дарэчы, ён узначальваў першую дзяржаўную экзаменацыйную камісію па літаратуразнаўчых і лінгвістычных дысцыплінах.

Сёння на філалагічным факультэце маецца восем літаратуразнаўчых і лінгвістычных кафедр, якія аб'ядноўваюць буйныя навуковыя сілы рэспублікі ў галіне мовазнаўства і літаратуразнаўства. На факультэцкіх кафедрах працуюць восем прафесараў — дактароў філалагічных навук, дзесяткі дацэнтаў — кандыдатаў навук, многа высокакваліфікаваных выкладчыкаў. Большасць з іх вядзе заняткі і са студэнтамі-завочнікамі.

Сярод выкладчыкаў факультэта ёсць члены Саюза пісьменнікаў БССР, вядомыя пісьменнікі, паэты і літаратуразнаўцы — М. Р. Ларчанка, А. А. Лойка, Н. С. Гілевіч, П. І. Ткачоў, М. Б. Яфімава, С. Х. Александровіч, Р. М. Семашкевіч, Д. Я. Бугаёў.

Філалагічнаму факультэту належыць важная роля ў развіцці лінгвістычнай і літаратуразнаўчай навукі ў Беларускай ССР, у падрыхтоўцы высокакваліфікаваных кадраў для народнай асветы, навуковых і культурных устаноў рэспублікі. Сярод вывыхаванцаў факультэта, якія займаліся па сістэме завочнага навучання, многа вядомых, заслужаных людзей. Інстытут літаратуры імя Янкі Купалы Акадэміі навук БССР узначальвае лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларускай ССР і прэміі Ленінскага камсамола БССР, член-карэспандэнт Акадэміі навук БССР, доктар філалагічных навук, прафесар І. Я. Навуменка. В. І. Старавойтаў — загадчык кафедры марксісцка-ленінскай філасофіі хіміка-тэхналагічнага інстытута імя С. М. Кірава. Заслужанай любоўю студэнтаў і вялікім аўтарытэтам сярод выкладчыкаў карыстаецца дацэнт кафедры рускай мовы, кандыдат філалагічных навук І. А. Карабань. Беларускаму чытачу добра вядомы імёны таленавітых беларускіх паэтэс Веры Вярбы і Галіны Каржанеўскай, якія закончылі завочнае аддзяленне філалагічнага факультэта.

Вучэбны працэс у сістэме завочнай падрыхтоўкі істотна адрозніваецца ад дзённага, стацыянарнага навучання — ён падзяляецца на вучэбна-экзаменацыйныя сесіі і перыяд міжсесійнай самастойнай работы студэнтаў-завочнікаў.

Студэнты-завочнікі вывучаюць увогуле тыя ж дысцыпліны, што і студэнты дзённага аддзялення, але, вядома, у некалькі меншым аб'ёме (таму, зразумела, цэнтр цяжару падае на самастойныя заняткі). Кафедры даюць рэкамендацыі, як лепш арганізаваць самастойнае вывучэнне матэрыялу ў перыяд паміж залікова-экзаменацыйнымі сесіямі, як выконваць кантрольныя, курсавыя і дыпломныя работы, як рыхтавацца да экзаменаў і залікаў.

На кафедрах факультэта рэгулярна — адзін раз у месяц — праводзяцца дні завочніка. У час іх студэнты могуць атрымаць кваліфікаваную кансультацыю або параду, ліквідаваць запазычанасць, па дамоўленасці з завочным факультэтам і адпаведнай кафедрай датэрмінова здаць той ці іншы экзамен або залік.

Студэнты-завочнікі ўдзельнічаюць у навукова-даследчай рабоце кафедр, выступаюць з дакладамі на навуковых канферэнцыях. Лепшыя студэнцкія работы штогод прадстаўляюцца на агляд навуковых работ вышэйшых навучальных устаноў рэспублікі.

Студэнты-завочнікі маюць права карыстацца і універсітэцкімі бібліятэкамі і чытальнымі заламі. Спецыяльна для іх вучонымі факультэта створан шэраг падручнікаў, вучэбных дапаможнікаў, метадычных распрацовак па асобных дысцыплінах.

Старанная вучоба, своечасовае выкананне вучэбнага плана гарантуюць студэнтам-завочнікам паспяховае заканчэнне універсітэта, атрыманне пачэснага і адказнага звання — настаўнік-філолаг.

**Б. МІЦКЕВІЧ,**
**загадчык кафедры**
**замежнай літаратуры,**
**дацэнт.**



# АДДЗЯЛЕННЕ ГЕАГРАФІІ

У саставе завочнага факультэта Белдзяржуніверсітэта імя У. І. Леніна ёсць і аддзяленне геаграфіі, выпускнікі якога атрымліваюць спецыяльнасць настаўніка геаграфіі сярэдняй школы.

Геаграфічны факультэт у саставе універсітэта (першапачаткова ён называўся—геолага-глеба-геаграфічны) быў арганізаван у сувязі з пастановай СНК СССР і ЦК ВКП(б) ад 16 мая 1934 года «Аб выкладанні геаграфіі ў пачатковай і сярэдняй школе».

У цяперашні час геаграфічны факультэт—вядучы цэнтр падрыхтоўкі кадраў для навукова-даследчай і вучэбна-метадычнай работы па геаграфіі ў Беларусі.

На факультэце працуе сем кафедр: агульнага землязнаўства, геадэзіі і картаграфіі, геалогіі і глебазнаўства, фізічнай геаграфіі СССР, фізічнай геаграфіі замежных краін, эканамічнай геаграфіі СССР і эканамічнай геаграфіі замежных краін, праблемная лабараторыя меліярацыі ландшафтаў і галіновая лабараторыя возеразнаўства, база праходжання вучэбных геаграфічных практык—геаграфічная станцыя «Заходняя Беразіна».

Навукова-выкладчыцкую работу на факультэце вядуць член-карэспандэнт АН БССР, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі БССР А. Р. Мядзведзеў, прафесары А. Я. Малышаў, М. Т. Раманоўскі, В. Ф. Якушка, В. А. Жучкевіч, Д. М. Карулін, 29 дацэнтаў і кандыдатаў навук, сярод якіх такія вопытныя выкладчыкі, як загадчык кафедры эканамічнай геаграфіі СССР І. І. Трухан, загадчык кафедры геадэзіі і картаграфіі В. Я. Крышчановіч, намеснік дэкана завочнага факультэта У. В. Стэцко, дацэнты У. А. Навіцкі, В. П. Барадзіна і іншыя.

З факультэтам на працягу многіх гадоў была звязана навукова-педагагічная дзейнасць вядомых географаў, прафесараў В. А. Дзяменцьева, В. Г. Заўрыева і А. Х. Шкляра.

Штогадовы выпуск спецыялістаў на факультэце складае на працягу 5 апошніх год каля 250 чалавек. За 1971—75 гады выпуск па ўсіх формах навучання склаў 1210 чалавек, у тым ліку на завочным аддзяленні—388 чалавек.

Выпускнікі факультэта ў асноўным працуюць у сістэме народнай адукацыі, а таксама ў навукова-даследчых і праектных арганізацыях.

Выпускнікамі завочнага аддзялення факультэта з'яўляюцца доктар геаграфічных навук А. Г. Булаўко, кандыдаты навук А. Н. Папова, Ф. П. Пятровіч, Н. К. Сакалоўскі, Т. Н. Раманава і іншыя.

Добра зарэкамендавалі сябе на педагагічнай рабоце скончыўшыя ў розныя гады завочнае аддзяленне геафака дырэктары школ: Шэйбакоўскай Лідскага раёна—А. А. Чурган, Казловіцкай Зельвенскага раёна—В. П. Філітовіч, Сяргеевіцкай Пухавіцкага раёна — Л. І. Мільчуй, дырэктар адной з мінскіх школ А. В. Папкоў, кіраўнік раённай секцыі настаўнікаў геаграфіі Дзятлаўскага раёна І. А. Балтрушка і многія іншыя.

На нашым факультэце завочнікі, як і студэнты стацыянара, атрымліваюць добрую падрыхтоўку, праходзяць комплексныя і галіновыя вучэбныя і вытворчыя геаграфічныя практыкі, удзельнічаюць у навукова-даследчай рабоце, выступаюць з навуковымі паведамленнямі і дакладамі на пасяджэннях гурткоў, канферэнцыях, прадстаўляюць работы на рэспубліканскі агляд. Завочнікі карыстаюцца асаблівай увагай прафесарска-выкладчыцкага калектыву геафака. Індывідуальныя і групавыя кансультацыі, гутаркі ў сесійны і міжсесійны перыяды, пастаянны кантакт і кантроль, якаснае чытанне лекцый, правядзенне семінарскіх і практычных заняткаў і многае іншае садзейнічае падрыхтоўцы высокакваліфікаваных спецыялістаў для народнай гаспадаркі.

**І. ГАЛАЙ,**
**С. СІДОР,**
**кандыдаты геаграфічных навук.**

# …ЖУРНАЛІСТЫКІ

дзяржаўных экзаменаў па навуковаму камунізму і журналістыцы.

На сучасным этапе камуністычнага будаўніцтва значна ўзрасла роля масавых сродкаў інфармацыі. Натуральна, узрасла і роля тых кадраў, якія працуюць ці будуць працаваць у рэдакцыях газет, часопісаў, радыёвяшчання, тэлебачання, выдавецтвах, тэлеграфным Агенцтве.

Значна павысілася адказнасць факультэтаў і аддзяленняў журналістыкі, якія заклікаyы рыхтаваць высокакваліфікаваных работнікаў друку, радыё і тэлебачання. Гэтыя кадры павінны спалучаць у сабе высокія ідэйна-маральныя якасці і прафесіянальнае майстэрства. Асаблівая ўвага звяртаецца на тое, каб забяспечыць дасканалае засваенне будучымі работнікамі масавых сродкаў інфармацыі тэорыі марксізму-ленінізму, гістарычнага вопыту КПСС, унутранай і знешняй палітыкі партыі, метадаў ідэалагічнай работы.

Выкладчыкі факультэта робяць усё для таго, каб дапамагчы будучым работнікам друку, радыё і тэлебачання глыбей авалодаць ленінскім майстэрствам палітычнага пераканання мас, вучыцца звязваць прапаганду камуністычных ідэалаў з рашэннем практычных задач, пераканаўча, з наступальных пазіцый весці барацьбу з ідэалагічнымі праціўнікамі.

Падрыхтоўка журналістаў на факультэце вядзецца па трох формах навучання: дзённай, вячэрняй і завочнай (6 год). Вучэбны працэс праходзіць з наступнай спецыялізацыяй: літаратурная работа ў газетах і часопісах, літаратурная работа ў радыёвяшчанні, літаратурная работа на тэлебачанні.

На працягу вучобы студэнты вядуць актыўную навукова-даследчую работу ў навуковых гуртках, займаюцца грамадскай работай.

У адпаведнасці з Правіламі прыёму на навучанне без адрыву ад вытворчасці (завочная і вячэрняя формы) прымаюцца асобы без абмежавання ўзросту, якія праявілі здольнасці да літаратурнай дзейнасці і паспяхова здалі уступныя экзамены.

У першую чаргу залічваюцца работнікі друку, радыёвяшчання, тэлебачання і выдавецтваў, якія маюць працоўны стаж па выбранай спецыяльнасці не менш 6 месяцаў.

Паступаючыя на ўсе формы навучання здаюць уступныя экзамены па рускай мове і літаратуры ці (па жаданню паступаючага) па беларускай мове і літаратуры (вусна і пісьмова), гісторыі СССР (вусна), адной з замежных моў (вусна).

Час прыёму дакументаў і правядзення ўступных экзаменаў па вячэрняй і завочнай формах навучання розны. Так, на завочную форму прыём дакументаў пачынаецца з 20 красавіка па 31 мая, а ўступныя экзамены праводзяцца з 1 па 20 чэрвеня.

Гэты артыкул адрасаван тым, хто цвёрда вырашыў стаць журналістам, актыўным байцом нашай партыі. І мы сардэчна запрашаем іх на факультэт журналістыкі.

**А. РАКОВІЧ,**
**намеснік дэкана**
**факультэта журналістыкі,**
**дацэнт.**

Слова дэлегату

## З'ЕЗД ПАСТАВІЎ ЗАДАЧЫ

У красавіку гэтага года ў Крамлёўскім Палацы з'ездаў праходзіў XVI з'езд прафсаюзаў СССР. Разам з прадстаўнікамі 13-мільённай арміі савецкіх прафсаюзаў мне выпаў гонар быць яго дэлегатам.

Уся работа прафсаюзнага форума праходзіла пад уздзеяннем прамовы, з якой у дзень адкрыцця з'езда выступіў Генеральны сакратар ЦК КПСС Л. І. Брэжнеў. У выступленнях дэлегатаў падведзены вынікі дзейнасці прафсаюзаў за мінулыя пяць год, пастаўлены задачы на дзесятую пяцігодку.

У выкананні гэтых задач важную ролю заклікаяы адыграць прафсаюзныя арганізацыі ВНУ. У справаздачным дакладзе ВЦСПС было адзначана, што прафсаюзным арганізацыям належыць выхоўваць моладзь на рэвалюцыйных, баявых і працоўных традыцыях, выхоўваць у моладзі гонар за сваю сацыялістычную Радзіму, пастаянную гатоўнасць да абароны заваёў Вялікага Кастрычніка. Гэта абавязвае нашых прафсаюзных актывістаў больш уважліва падыходзіць да арганізацыі сацыялістычнага спаборніцтва паміж групамі і факультэтамі, змагацца з парушальнікамі вучэбнай дысцыпліны і правіл сацыялістычнага супольнага жыцця, шырока прапагандаваць вопыт лепшых студэнтаў і груп.

**У. ПАЎЛОЎСКІ,**
**старшыня прафкома БДУ.**



Інтэрнат № 2.

# НАШ ДРУГІ ДОМ

«Дастойнай сустрэчы 60-годдзя Вялікага Кастрычніка і выкананню рашэнняў XXV з'езда КПСС прысвячаецца». Пад такім дэвізам праходзіў месячнік на лепшы студэнцкі інтэрнат БДУ. Палажэнне аб месячніку папярэдне было перададзена на факультэты і ў інтэрнаты для азнаямлення з асноўнымі задачамі і ўмовамі. Была створана камісія па праверцы выканання асноўных ўмоў месячніка. За перыяд з 1 па 31 сакавіка камісія наведала ўсе інтэрнаты, праверыла жыллёва-бытавыя ўмовы пражывання студэнтаў, забяспечанасць студэнтаў неабходным інвентаром і абсталяваннем. Вялікая ўвага была звернута на ролю грамадскіх арганізацый па правядзенню палітыка-выхаваўчай работы сярод студэнтаў, афармленне ленінскіх пакояў і нагляднай агітацыі, прысвечанай памятным датам нашай дзяржавы. Аб'ектыўнасць і паўната—вось тыя прынцыпы, якімі кіравалася камісія ў падвядзенні вынікаў і ацэнцы работы студсаветаў па выкананню ўсіх умоў месячніка. У канчатковым выніку месцы размеркаваліся наступным чынам:

I месца—інтэрнат № 2;
II месца—інтэрнат № 4;
III месца—інтэрнат № 6.

Гэтыя інтэрнаты будуць узнагароджаны ганаровымі граматамі рэктарата, камітэта камсамола, прафкома і каштоўнымі падарункамі. Старшыні студсаветаў інтэрнатаў-прызёраў — бясплатнымі пуцёўкамі ў прафілакторый.

Зусім нядаўна наш калектыў прымаў віншаванні з выпадку ўзнагароды Белдзяржуніверсітэта Ганаровай граматай і пераходным Чырвоным сцягам ЦК КПСС, ЦК ВЛКСМ і ВЦСПС. Таму нашаму активу, усім студэнтам нельга спыняцца на дасягнутых поспехах, як нельга закрываць вочы і на нашы недахопы.

Так, не зжыта яшчэ усеагульнае няшчасце інтэрнатаў — абклейванне сцен рознымі выразкамі, плакатамі і да т. п. Санітарны стан некаторых пакояў, мякка кажучы, прымушае жадаць лепшага. Ёсць выпадкі п'янства, псавання інтэрнацкай маёмасці. У гэтых выпадках пэўныя меры прымаюць органы студэнцкага самакіравання—студсаветы. Трэба і далей весці бязлітасную барацьбу з любымі парушэннямі правілаў сацыялістычнага супольнага жыцця, дабівацца ганаровага звання — інтэрната ўзорнага быту.

Інтэрнат — наш другі дом на ўсе 5 год вучобы ва універсітэце, і тое, якім яму быць, залежыць толькі ад нас саміх. Адміністрацыі і студсаветам інтэрнатаў патрэбна ўлічыць тыя заўвагі, якія былі выказаны ў іх адрас, і 60-годдзе Вялікага Кастрычніка сустрэць больш высокімі паказчыкамі як у ідэалагічнай рабоце, так і ў быце.

**У. ЛОКІС,**
**намеснік старшыні**
**прафкома БДУ.**

# ПОСПЕХ ДРУЖНЫХ

Па выніках сацспаборніцтва наша група заняла III месца ва універсітэце.

Калектыў групы пачаў фарміравацца два гады назад, калі мы выбралі сваёй спецыяльнасцю эканамічную геаграфію. Група невялікая —усяго 17 чалавек, але людзі ў нас самыя розныя: адны да паступлення ва універсітэт служылі ў радах Савецкай Арміі, другія працавалі на вытворчасці, большасць жа прыйшла са школьнай лаўкі.

Прайшло нямала часу і спатрэбілася шмат намаганняў, перш чым у нас склаўся калектыў. Усе мерапрыемствы, якія мы праводзілі, былі накіраваны на дасягненне галоўнай мэты — добрай вучобы. А такіх мерапрыемстваў было нямала—канферэнцыі чытачоў, «агеньчыкі», вечары адпачынку, паездкі за горад, культпаходы ў кіно, тэатры, удзел у спартыўных спаборніцтвах, мастацкай самадзейнасці. Кожны студэнт у групе мае пастаяннае грамадскае даручэнне, многія з'яўляюцца членамі гуртка «Эканамічная геаграфія СССР», удзельнічаюць у рабоце студэнцкіх навуковых канферэнцый. Асабліва запомнілася нам першае мерапрыемства — «агеньчык», прысвечаны гораду-герою Мінску. Некаторыя з нас падрыхтавалі кароткія выступленні аб горадзе, другія чыталі вершы. Мы даведаліся шмат новага аб сталіцы рэспублікі.

Немалаважную ролю ў фарміраванні калектыву нашай групы адыграла куратар Л. Паўловіч, якая была ініцыятарам многіх і ўдзельнікам усіх мерапрыемстваў.

Па выніках сацыялістычнага спаборніцтва сярод груп мы былі на трэцім месцы. Узнагарода групе—паездка ў Талін. За два дні, праведзеныя ў сталіцы Эстоніі, мы азнаёміліся з гістарычнымі мясцінамі горада, даведаліся аб многім новым у геraічнай барацьбе эстонскага пралетарыяту за Савецкую ўладу, аб развіцці гаспадаркі сённяшняй Эстоніі.

**М. СТРУК,**
**староста I курса геафака.**
**Р. ТЫБЕРБАЙ,**
**прафорг.**

# І Ў ВУЧОБЕ, І Ў АДПАЧЫНКУ...

Вельмі хутка адзін за другім праходзяць дні студэнцкага жыцця. Лекцыі, чытальныя залы, сустрэчы, справы.

Вось шумнай чарадой, крыху стомленыя, выходзяць студэнты пасля лекцый. Многія з іх накіруюцца ў студэнцкі інтэрнат № 2 БДУ імя У. І. Леніна. Як праводзяць тут свой вольны час студэнты чатырох факультэтаў, што пражываюць тут? Сёння адказ на пытанне мы шукаем у хімфакаўцаў. Гутарым са студэнтамі і членамі студсавета. Вярнуўшыся з заняткаў, студэнты часта бачаць аб'явы: «Сёння будзе праводзіцца...» Вечарам яны слухаюць гутаркі на розныя тэмы, сустракаюцца з цікавымі людзьмі. Студсавет трымае цесную сувязь з кафедрамі факультэта: гасцямі студэнтаў бываюць выкладчыкі. Нядаўна з лекцыяй «Англія вачыма савецкага вучонага» выступіў дэкан хімфака Г. А. Браніцкі. Байцы студэнцкага будатрада «Купалінка» з захапленнем успамінаюць свой «агеньчык». Хлопцы арганізавалі спаборніцтвы па футболу паміж паверхамі. Як бачна, хімфакаўцы не сумуюць. Ніна Драчапоўская, член студсавета, выказала думку, што вечары ў інтэрнаце трэба праводзіць часцей і больш арганізавана. І гэта—пажаданне многіх студэнтаў.

Студэнты могуць прыйсці ў ленінскі пакой. Ён аформлен прыгожа, з добрым мастацкім густам і лічыцца лепшым у інтэрнаце № 2.

Ад Іры Самойленкі, члена жыллёва-бытавой камісіі, я даведалася аб аглядзе-конкурсе на лепшы пакой, аб суботніках па добраўпарадкаванню, праводзімых студэнтамі. Але іншы раз на парадак пасяджэння студсавета выносіцца пытанне аб дрэнным дзяжурстве на паверсе ці незадавальняючым стане пакоя. Напэўна, трэба больш увагі удзяляць гэтым парушэнням у насценгазеце «Хімік», якая заўсёды прыцягвае ўвагу студэнтаў факультэта.

Не так даўно стаў старшынёй студсавета Анатоль Грынчанка. Толя выказаў думку, што жыццё студэнтаў у інтэрнаце патрабуе пошуку новых цікавых форм работы. У плыні агульнапрынятага гэта зрабіць не вельмі проста. І тым не менш пытанне гэта для студсавета становіцца ўсё больш актуальным.

Аб чым жа будзе паведамляць хімфакаўцам, пражываючым у інтэрнаце, наступная аб'ява: «Увага! Сёння мы запрашаем...»?

**В. ПЯРВАЯ,**
**студэнтка факультэта**
**журналістыкі.**

Матэрыялы старонкі падрыхтавала да друку наш няштатны карэспандэнт Н. РОШЧЫНА.

Рэдактар А. А. ДЗЕРАШ.

НАШ АДРАС Мінск, універсітэцкі гарадок, геаграфічны корпус, п. 14. Тэлефон 22-07-19.

АТ 02213 Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КП Беларусі. Заказ № 806.